ДЭПУТАТ І ЖЫЦЦЁ

# ВЫДАТНАЕ — У БЫТ

**Ц. КІСЯЛЁЎ**
**Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР**

**У** ХОДЗЕ БУДАЎНІЦТВА камунізма фарміруецца новы чалавек. Партыя нястомна клапоціцца аб яго ідэйным і эстэтычным выхаванні, аб усебаковым задавальненні яго патрэбнасцей. На XXII з'ездзе КПСС таварыш М. С. Хрушчоў гаварыў: «У сучасных умовах трэба ўдзяляць сур'ёзную ўвагу эстэтычнаму выхаванню, фарміраванню мастацкіх густаў ва ўсіх савецкіх людзей, аб'явіць рашучую барацьбу безгустоўнасці, у чым бы яна ні праяўлялася — у фармалістычных захапленнях або ў мяшчанскіх уяўленнях аб «прыгожым» у мастацтве, у жыцці, у быце».

Выхоўваць добры густ — гэта, у пэўнай ступені, азначае ствараць, фарміраваць выдатнага чалавека.

Духоўныя, культурныя запатрабаванні савецкага чалавека нязменна ўзрастаюць. З павышэннем матэрыяльнага дабрабыту нашы людзі хочуць лепш, прыгажэй апранацца, мець прыгожую мэблю, прадметы культурна-бытавога ўжытку. І трэба сказаць, наша прамысловасць у многім задавальняе гэтыя запатрабаванні.

Прадпрыемствы Беларусі за чатыры гады сямігодкі далі больш, чым намячалася планам: дзевяць мільёнаў пар скуранога абутку, сорак чатыры мільёны пагонных метраў ільняных і чатыры мільёны семсот тысяч метраў шарсцяных тканін, больш чым 340 тысяч тэлевізараў, восемдзесят тысяч матацыклаў, на сорак шэсць мільёнаў рублёў мэблі. Цяпер выпускаюцца новыя віды тканін, трыкатажных вырабаў, абутку, тавараў культурна-бытавога і гаспадарчага ўжытку.

Узят трывалы курс на павышэнне якасці тавараў народнага ўжытку. Саўнаргасу і Галоўбытмясцпрому ўстаноўлена дадатковае заданне па выпуску вырабаў павышанай якасці, якія карыстаюцца вялікім попытам. У Мінску пры філіяле Усесаюзнай гандлёвай палаты створан мастацкі савет, закліканы садзейнічаць выпуску новых тавараў па лепшых узорах. Такія ж саветы ёсць пры Галоўным упраўленні бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці, рэспубліканскім Доме мадэлей, на радзе прадпрыемстваў. У саставе тэхніка-эканамічнага савета саўнаргаса арганізавана мастацка-тэхнічная секцыя. Усе яны павінны адбіраць і зацвярджаць для вытворчасці лепшыя ўзоры вырабаў, новыя фасоны і мадэлі. І трэба сказаць, што дзякуючы іх намаганням у нас з'яўляецца ўсё больш высакаякасных і прыгожых тавараў.

У гарадах Мінску і Гомелі на базе некалькіх абутковых прадпрыемстваў арганізаваны вытворчыя аб'яднанні — фірмы. Мяркуецца, што ў далейшым гэтыя аб'яднанні будуць мець свае фірменныя магазіны. Такім чынам, самі вытворцы будуць вывучаць попыт спажыўцоў, лепш ведаць іх прэтэнзіі.

Але неабходна дабіцца, каб усе нашы вырабы былі толькі выдатныя, каб заклік «савецкае — значыць выдатнае» стаў сапраўднасцю паўсюдна.

У гандлёвай сетцы няма цяпер недахвату ў адзенні і абутку. І тым не менш попыт насельніцтва на гэтыя рэчы задаволен не поўнасцю. Справа ў тым, што абмежаван іх выбар, скапілася многа так званых «нехадавых» тавараў — нізкіх па якасці, выйшаўшых з моды фасонаў. І ўсё ж некаторыя прадпрыемствы працягваюць насычаць гандлёвую сетку ўсё той жа ўстарэлай прадукцыяй.

Дзяржаўная інспекцыя па якасці Міністэрства гандлю БССР забракавала і вярнула на перапрацоўку, а таксама панізіла ў гатунку каля трэці ўсіх правераных ёю ў першым паўгоддзі вырабаў на прадпрыемствах саўнаргаса і Галоўнага ўпраўлення бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці.

У чым справа? Дзе корань зла? Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі і Савет Міністраў рэспублікі нядаўна прааналізавалі прычыны выпуску нізкаякасных тавараў шырокага ўжытку. Выявілася, што кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, як правіла, задавальняюцца агульнымі паказчыкамі, не прад'яўляюць высокай патрабавальнасці да якасці вырабаў.

ЦК КП Беларусі і Савет Міністраў рэспублікі строга пакаралі вінаватых: знят з пасады дырэктар Віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» тав. Седуноў; за прымірэнчыя адносіны да выпуску тавараў нізкай якасці начальніку ўпраўлення лёгкай прамысловасці саўнаргаса тав. Жукоўскаму аб'яўлена вымова.

**Я** К ВІДАЦЬ, трэба яшчэ раз вярнуцца да размовы аб «вале». Пры ацэнцы дзейнасці прадпрыемства, пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва якасць выпускаемай прадукцыі рэдка знаходзіць адлюстраванне. Упор робіцца на колькаснае выкананне плана. На радзе прадпрыемстваў у працэсе спаборніцтва не выхоўваюць пачуцця адказнасці калектыву, не падтрымліваюць рабочай прафесіянальнай годнасці, барацьбы за гонар фабрычнай маркі. Папрок у гэтым трэба аднесці не толькі да кіраўнікоў прадпрыемстваў, але і да грамадскіх арганізацый — партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх, а таксама да выканкомаў Саветаў.

Недастаткова патрабавальная і служба тэхнічнага кантролю, таму нярэдка гатовыя вырабы ў працэсе рэалізацыі пераводзяцца ў ніжэйшыя гатункі. Работнік аддзела кантролю ставіць кляймо: «першы гатунак», а на паверку аказваецца, што тавар не толькі не адпавядае гэтай маркіроўцы, але з'яўляецца бракам і адпраўляецца на перапрацоўку. На многіх фабрыках апарат тэхнічнага кантролю ўкамплектаван недастаткова кваліфікаванымі кадрамі, тэхнічныя веды гэтых работнікаў не павышаюцца. А бывае, што, «ратуючы» лжыва зразуметы гонар прадпрыемства, кантралёр дзейнічае наперакор сумленню і заведама завышае гатунковасць.

Трэба ўмацаваць аддзелы тэхнічнага кантролю высокакваліфікаванымі кадрамі, арганізаваць іх сістэматычную вучобу. Каб павысіць адказнасць, мэтазгодна, думаецца нам, перадаць службу тэхнічнага кантролю з ведання дырэктараў прадпрыемстваў у падпарадкаванне савету народнай гаспадаркі і Галоўбытмясцпрому.

Неабходна ўцягнуць у барацьбу за якасць шырокую грамадскасць. Паказальны ў гэтых адносінах вопыт некаторых нашых прадпрыемстваў. Да прыкладу, кантроль самых рабочых у цэхах філіяла № 1 абутковага аб'яднання «Прамень» даў магчымасць значна палепшыць якасць прадукцыі. І ў той жа час штатных кантралёраў стала на дзесяць чалавек менш. Заслужанай павагай карыстаюцца грамадскія кантралёры, якія выбіраюцца на рабочых сходах.

Хачу падкрэсліць: сапраўды невычарпальная ініцыятыва рабочых, інжынераў і тэхнікаў, якія праяўляюць клопаты аб павышэнні якасці, паляпшэнні асартымента і павелічэнні выпуску прадукцыі. Трэба толькі даць ёй выхад. Шырокі водгук у рэспубліцы знайшоў заклік ткачыхі Мінскага тонкасуконнага камбіната А. С. Лазарэнкі аб спаборніцтве за выдатную якасць прадукцыі, за асваенне новых відаў тканін у скарочаныя тэрміны без зніжэння прадукцыйнасці працы і абсталявання. Падлічана, што пашырэнне гэтага пачыну дасць магчымасць камбінату дадаткова выпрацаваць за год не менш чым 75 тысяч метраў выдатных шарсцяных тканін. Выконваючы свае абавязацельствы, тав. Лазарэнка дасягнула прадукцыйнасці ткацкага станка, запланаванай на апошні год сямігодкі, і дае прадукцыю толькі выдатнай якасці.

Важна стварыць на прадпрыемствах абстаноўку высокай патрабавальнасці, выхоўваць пачуццё адказнасці за даручаную справу. А кожны выпадак выпуску дрэннай прадукцыі павінен лічыцца надзвычайным здарэннем і рабіцца прадметам абмеркавання ў калектыве. Настойлівую, штодзённую барацьбу за высокую якасць прадукцыі трэба весці на ўсіх стадыях вытворчасці — ад пярвічнай апрацоўкі сыравіны да канчатковай аддзелкі і ўпакоўкі вырабаў. Толькі так мы даб'ёмся выдатнай якасці прадукцыі.

Пры існуючай спецыялізацыі і кааперацыі вытворчасці ў стварэнні, скажам, радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў, удзельнічаюць не адзін, а некалькі заводаў, і ўсе яны абавязаны ў аднолькавай ступені быць адказнымі за павышэнне тэрміну службы, дабротнасць вырабаў.

Неабходна пастаянна ўдасканальваць прафесіянальнае майстэрства рабочых, павышаць іх кваліфікацыю. Задавальненне эстэтычных густаў народа ў многім залежыць ад мастакоў, мадэльераў, канструктараў, занятых у сферы выпуску тавараў народнага ўжытку. На многіх прадпрыемствах тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці саўнаргаса створаны канструктарскія аддзелы, уведзены пасады мастакоў-мадэльераў, мастакоў-дэсінатараў і г. д. Трэба рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры мастакоў для прамысловасці. Цяпер такіх спецыялістаў не хапае: заяўкі ўпраўлення лёгкай прамысловасці саўнаргаса рэспублікі на мастакоў-мадэльераў вось ужо на працягу раду гадоў не задавальняюцца і на адну чвэрць.

Ключ да вырашэння праблемы якасці ляжыць і ў павышэнні матэрыяльнай зацікаўленасці асобных работнікаў і прадпрыемстваў у цэлым. Неабходна ўдасканальваць прэміяльную сістэму аплаты працы: адзначаць трэба не толькі за перавыкананне плана па «валу», але і за высокую якасць тавараў, прыслухоўваючыся пры гэтым да ацэнкі спажыўцоў.

**Д** ЗЯРЖАВА дала гандлёвым арганізацыям вялікія правы — уплываць на павелічэнне выпуску тавараў, якія карыстаюцца павышаным попытам. Яны могуць прыпыняць прыёмку ад прадпрыемстваў недабраякасных тавараў. Але, на жаль, гэтыя правы работнікі гандлю не заўсёды выкарыстоўваюць. Вось чаму кіраўнікі прадпрыемстваў нярэдка парушаюць устаноўлены парадак зацвярджэння планаў выпуску тавараў, па якім такія планы павінны складацца на падставе заявак гандлёвых арганізацый. Вось чаму асядаюць на складах нехадавыя тавары, павялічваючы таварныя рэшткі.

Дзяржплан Саюза ССР павінен больш аператыўна вырашаць пытанні забеспячэння прамысловасці неабходнымі матэрыяламі, абсталяваннем і запаснымі часткамі. Цяпер на прадпрыемствах нямала маральна і фізічна ўстарэлай тэхнікі.

Неабходна больш дакладна спецыялізаваць прадпрыемствы па выпуску тавараў шырокага ўжытку (швейных вырабаў, абутку і г. д.) у эканамічных раёнах, улічыўшы набыты тут вопыт. Гэты вопыт трэба вывучаць глыбей, больш сур'ёзна, узаемна ўзбагачаць ім эканамічныя раёны, пастаўляць іншым рэспублікам лепшыя ўзоры вырабаў і перадаваць лепшую тэхналогію іх вытворчасці. Карысна шырэй выкарыстоўваць і зарубежную практыку.

На сучасным этапе будаўніцтва камунізма работнікам савецкага апарату трэба ўсё больш шукаць, дзярзаць, тварыць, каб паўней задавальняць культурныя і бытавыя запатрабаванні насельніцтва. Няма нічога больш пачэснага, чым быць на вышыні гэтых патрабаванняў партыі.

**(«Известия» за 8 верасня г. г.).**